

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 10 (166) 9 КРАСАВІКА 1991 ГОДА

*ВІНШУЕМ!*

## ШЧАСЛІВАЙ ДАРОГІ!

Такія святы адбываюцца далёка не кожны год. А падзея гэтая тым больш значная, што ў нашай рэспубліцы такіх прэцэдэнтаў яшчэ няма.

2 красавіка, у прыгожы веснавы дзень, калі ўсё пачынае абуджацца, нараджацца пасля доўгай зімы, у нашым універсітэце святкавалі нараджэнне новага факультэта, факультэта беларускай філалогіі і культуры. Густоўна аформлена сцэна, пачуццё незвычайнасці, нейкай прыўзнятасці стваралі адчуванне сапраўднай урачыстасці. Нарэшце спраўдзіліся надзеі выкладчыкаў, у студэнтаў з 'явілася яшчэ адна магчымасць наблізіцца да сваёй мовы, да літаратуры, да культуры свайго народа.

А наперадзе — вялікая праца, цяжкая, клапатлівая. І вельмі хацелася б, каб выкладчыкі і студэнты новага факультэта сталі адной сям 'ёй, аб 'яднанай агульнай прагай ведаў, агульным імкненнем стварыць сапраўдную і шчырую атмасферу беларускасці, атмасферу выхавання беларускай інтэлігенцыі.

На адкрыцці факультэта прысутнічалі госці з Польшчы: загадчык кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, старшыня беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы Алесь Баршчэўскі, дацэнт кафедры беларускай філалогіі гэтага ж універсітэта Янка Чыквін, доктар геаграфіі Уладзімір Юзвюк. З Мінску прыехаў старшыня міжнароднай асацыяцыі беларусістаў Адам Мальдзіс. Прысутнічалі таксама начальнік упраўлення адукацыі аблвыканкама А. С. Саўчык, начальнік упраўлення культуры аблвыканкама, старшыня абласнога аддзялення мастакоў.

Адкрыў святочны сход прарэктар нашага універсітэта Сяргей Аляксандравіч Габрусевіч. Ён выказаў думку, што адкрыццё факультэта беларускай філалогіі і культуры — вялікая справа для нашага народа і для Беларусі. Ёсць спадзяванні, што гэты факультэт стане сапраўдным навуковым, метадычным і духоўным цэнтрам.

Прамова дэкана новага факультэта Ігара Васільевіча Жука была вельмі цікавай, змястоўнай і канкрэтнай. «Факультэт павінен стаць прыступкай да важнага страчанага звяна нацыянальнага выхавання, да канцэпцыі беларускай школы. Асноўная задача факультэта — стварэнне кваліфікаваных кадраў нацыянальнай інтэлігенцыі. Кожнаму народу, як і кожнаму чалавеку, уласцівы пэўны лад мыслення, які выпрацоўваецца стагоддзямі. І менавіта ў гэтым каштоўнасць кожнага народа, кожнай нацыі. Таму нацыянальная канцэпцыя навучання робіцца сёння ідэяй першачарговай важнасці. Трэба змяніць сам лад адукацыі». Ігар Васільевіч выказаў надзею, што факультэт стане застрэльшчыкам інакшых канцэпцый навучання. На ўзбраенне бярэцца інтэгрыруючы прынцып навучання, узаемапранікненне аднаго прадмета ў другі. Была выказана надзея на ўзаемадзеянне з усімі факультэтамі.

Наш госць з Польшчы Алесь Баршчэўскі ў сваёй прамове вітаў факт паклікання да жыцця новага факультэта і звязваў з ім вялікія надзеі. Умацоўваюцца сувязі нашага універсітэта імя Я. Купалы і Варшаўскага універсітэта, беларусаў Польшчы і жыхароў нашай рэспублікі. «Мы — дзве розныя дзяржавы,— сказаў Алесь Андрэевіч,— але адзін народ. І крыніца адраджэння заўжды павінна напаўняцца жывою вадою, таму стварэнне факультэта — вельмі патрэбная і карысная справа».

Ад імя творчага калектыву нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны, што знаходзіцца ў Мінску, павіншаваў усіх са святам Адам Іосіфавіч Мальдзіс. Ён распавёў прысутным у зале пра творчыя планы цэнтра і выказаў надзею на далейшае плённае супрацоўніцтва. «Факультэт беларускай філалогіі і культуры вельмі карысны для грамадства,— сказаў Адам Іосіфавіч.— Фундамент грамадства — культура. І таму адкрыццё факультэта — гэта пачатак заснавання па-сутнасці новага фундаменту для новага грамадскага будынку. І будынак гэты павінен быць добрым, каб спакойна жылі ў ім і дзеці нашыя, і ўнукі. Менавіта таму важна вельмі, што гэтая аснова духоўнай культуры, нацыянальнай свядомасці нарэшце, будзем спадзявацца, выявілася». Адам Іосіфавіч папрасіў гарадскія ўлады не быць абыякавымі да лёсу народжанага элемента, што стварыўся ва універсітэце. Ён перадаў некалькі кніг, аўтарам і сааўтарам якіх з 'яўляецца сам, у фонд будучай бібліятэкі факультэта.

Начальнік абласнога ўпраўлення народнай асветы Аляксандр Міхайлавіч Саўчык гаварыў, што патрэбна салідная праца ўсіх, каб здзейсніць усе спадзяванні, каб закон аб мовах нарэшце ўступіў у сваю рэальную сілу. Ён пажадаў поспехаў выкладчыкам і хуткай сустрэчы ў школах студэнтам новага факультэта.

Букет прыгожых чырвоных гваздзік падаравала Ігару Васільевічу Жуку ад імя філалагічнага факультэта Мая Аляксандраўна Зянькова. Яна спадзяецца, што з аудыторый факультэта беларускай філалогіі і культуры будуць выходзіць сапраўдныя беларускія інтэлігенты.

На гэтым святочны вечар быў скончаны. Прыемна, што ўсё праходзіла ў атмасферы шчырасці, павагі і разумення. Новы факультэт спрабуе рабіць яшчэ толькі першыя крокі. І вельмі хочацца спадзявацца, што наперадзе ў яго доўгая і шчаслівая дарога.

Мікалай Канстанцінавіч Рэрых пісаў: «Калі збяром усе азначэнні культуры, мы знойдзем сінтэз сапраўднага Дабра, крыніцу асветы і творчай прыгажосці».

Што ж, у добры час! Плённых табе пошукаў і вечнай маладосці, новы факультэт!

НА ЗДЫМКУ: на святочным адкрыцці факультэта выступае прарэктар па вучэбнай рабоце Сяргей Аляксандравіч Габрусевіч.

С. ЛАЎНІК.



*ПЫТАННЕ — АДКАЗ*

### ЯК НАБЫЦЬ ДРУГУЮ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

Цяпер прадставілася магчымасць адказаць на гэтае пытанне. У пачатку 1991 года Дзяржаўным камітэтам СССР па народнай адукацыі выдадзены адпаведны загад. Ім устаноўлены наступны парадак атрымання другой спецыяльнасці (прафесіі) асобамі, якія маюць вышэйшую адукацыю і пажадалі атрымаць другую спецыяльнасць.

Пры адпаведнасці раней атрыманай падрыхтоўкі зноў выбранай спецыяльнасці (прафесіі) ўказаныя асобы, незалежна ад профілю іх работы, рашэннем рэктара могуць быць залічаны ў навучальную ўстанову на адпаведны курс (акрамя першага).

Пры немагчымасці залічэння на другі курс па прычыне неадпаведнасці пройдзеных дысцыплін або праграмных патрабаванняў, жадаючыя набыць другую спецыяльнасць (прафесію) паступаюць у навучальную ўстанову на агульных падставах, згодна з правіламі прыёму ў ВНУ. Студэнтам прадастаўлена права адначасова вучыцца ў дзвюх навучальных установах або па дзвюх спецыяльнасцях у адной ВНУ. Пры немагчымасці залічэння на другі курс з-за неадпаведнасці праграмных патрабаванняў, студэнты паступаюць у іншую ВНУ, або на другую спецыяльнасць (прафесію) той жа навучальнай установы на агульных падставах.

Пры паступленні для набыцця другой спецыяльнасці ў прыёмную камісію навучальнай установы неабходна прадставіць натарыяльна завераную копію дакумента аб адукацыі.

Асобы залічаныя ў навучальную ўстанову на вячэрнюю або завочную форму навучання для атрымання другой спецыяльнасці (прафесіі), карыстаюцца льготамі, прадугледжанымі пастановай Савета Міністраў СССР ад 24.12.82 г. № 1116 на агульных падставах.

### ЛЯ КРЫНІЦ САВЕТА

Нядаўна рэктарам Яраслаўскага універсітэта быў падпісаны загад, на аснове якога ва універсітэце створаны Савет па гуманітарныай адукацыі ў мэтах рэалізацыі «Праграмы адраджэння і развіцця гуманітарнай адукацыі ў

# ДАГАВОР ГОД

## РАЗДЗЕЛ V

Жыллёва-бытавыя ўмовы

5.1. Здзейсніць мерапрыемствы па паляпшэнню жыллёвых умоў прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў універсітэта ў адпаведнасці з жыллёвым кодэксам БССР і адпаведнымі дакументамі аблвыканкама.

Адказныя — рэктарат, прафкам.

5.2. Размеркаванне жыллёвай плошчы здзяйсняць у строгай адпаведнасці са спісам людзей, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, улічваючы пры гэтым права некаторых катэгорый работнікаў на першачарговае і пазачарговае атрыманне жылля згодна з ЖК БССР

Адказныя — рэктарат, прафкам.

5.3. Лічыць, што выкладчыкі, якія забяспечаны жыллёвай плошчай менш 9 $м^2$ на члена сям 'і, якія добрасумленна працавалі ва універсітэце 20 і больш гадоў, і якія маюць выдатныя вынікі ў навуковай і вучэбнай дзейнасці, маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

5.4. Скласці для асоб, пералічаных у пункце 5.3., спіс чарговасці атрымання жылля, даючы ім жыллёвую плошчу, пабудаваную універсітэтам за кошт асабістых сродкаў і ад долевага ўдзелу.

Адказныя — рэктарат, прафкам.

5.5. Арганізаваць два новыя садаводчыя таварыствы.

Адказныя — рэктарат, прафкам.

5.6. Распрацаваць Палажэнне аб парадку аказання матэрыяльнай дапамогі работнікам універсітэта — членам ЖСК, а таксама тым, хто вядзе індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва.

Адказныя — рэктарат, прафкам, бухгалтэрыя.

5.7. Правесці ўсе неабходныя падрыхтоўчыя работы для пачатку ў 1991 годзе будаўніцтва жылога дома для выкладчыкаў універсітэта па вул. Горкага.

Адказныя — рэктарат, прафкам.

5.8. Стварыць з ліку выкладчыкаў, будучых жыльцоў дома па вул. Горкага, будаўнічыя брыгады для аказання дапамогі пры ўзвядзенні гэтага жылога аб 'екта.

Адказныя — рэктарат, прафкам.

5.9. Сфарміраваць два студэнцкія будаўнічыя атрады для аказання дапамогі ў летні час пры будаўніцтве жылога дома па вул. Горкага для выкладчыкаў універсітэта.

Адказныя — рэктарат, прафкам, камітэт камсамола.

## РАЗДЗЕЛ VI

Сацыяльнае страхаванне і грамадскае харчаванне.

6.1. Правесці мерапрыемствы па расшырэнню асартыменту і паляпшэнню якасці гатуемых страў і страў, якія завозяцца гатовымі ў буфетах і сталовых універсітэта.

Адказныя — рэктарат, прафкам.

6.2. Укамплектаваць буфеты (інтэрнаты №№ 2 і 3, вучэбны корпус па вул. Дабатара) неабходным абсталяваннем і мэбляй.

Адказныя — прарэктар па АГР.

6.3. Дабівацца арганізацыі работы стала заказаў.

Адказныя — рэктарат, прафкам.

6.4. Членам ЖБК прафкама здзяйсняць рэгулярны грамадскі кантроль за работай сталовых і буфетаў.

Адказны — прафкам.

6.5. Забяспечваць работнікаў універсітэта, якія маюць патрэбу ў дыетхарчаванні, льготнымі дыетпуцёўкамі.

Адказны — прафкам.

6.6. Набыць пуцёўкі для лячэння і адпачынку работнікаў за кошт сродкаў універсітэта і прафкама.

Адказныя — прафкам, рэктарат.

6.7. Аказваць работнікам матэрыяльную дапамогу, у першую чаргу інвалідам, пенсіянерам, сем 'ям, у якіх шмат дзяцей, малазабяспечаным сем 'ям, у межах зацверджаных каштарысаў.

Адказныя — рэктарат, прафкам.

6.8. Жанчынам, якія маюць дзяцей дашкольнага ўзросту, даваць па жаданню водпуск у час школьных канікулаў

Адказныя — рэктарат, аддзел кадраў, кіраўнікі падраздзяленняў.

6.9. Распрацаваць Палажэнне аб дадатковых мерах па паляпшэнню ўмоў працы, быту і адпачынку ветэранаў ВАВ і працы, мнагадзетных і малазабяспечаных сем 'яў.

Адказны — прафкам.

## РАЗДЗЕЛ VII

Культурная, спартыўна-масавая работа, медыцынскае абслугоўванне і арганізацыя адпачынку.

7.1. Арганізоўваць экскурсіі па гістарычных месцах Беларусі і культурных цэнтрах краіны, асабліва ў канікулы школьнікаў.

Адказны — прафкам.

7.2. Набыць за кошт сродкаў прафкама і ФНТСР турысцкія пуцёўкі.

Адказныя — рэктарат, прафкам.

7.3. Арганізоўваць загарадныя паездкі выхадного дня і цэнтралізаванае забеспячэнне супрацоўнікаў білетамі на канцэрты, у тэатры.

Адказны — прафкам.

7.4. Арганізаваць цэнтр фізкультуры і здароўя.

Адказныя — рэктарат, факультэт фізічнай культуры.

7.5. Аплачваць расходы на заняткі ў платных гуртках для дзяцей з мнагадзетных і малазабяспечаных сем 'яў.

Адказныя — прафкам, бухгалтэрыя.

7.6. Даваць работнікам універсітэта (па заяве), са згоды калектываў падраздзяленняў, водпуск без захавання заработнай платы пры наяўнасці пуцёўкі для лячэння і адпачынку, а таксама па сямейных абставінах (працягласцю да 2-х тыдняў).

Адказныя — рэктарат, аддзел кадраў, бухгалтэрыя.

7.7. Забяспечваць дзяцей работнікаў універсітэта пуцёўкамі ў піянерскія лагеры.

Адказны — прафкам.

7.8. Арганізоўваць дзіцячыя ранішнікі і вечары адпачынку для работнікаў універсітэта.

Адказны — прафкам.

7.9. Правесці неабходныя падрыхтоўчыя работы для стварэння ўласнага медыцынска-аздараўленчага цэнтру.

Адказныя — рэктарат, факультэт фізічнага выхавання.

Прафкам універсітэта шчыра просіць вас, дарагія чытачы, дасылаць у яго адрас свае меркаванні, заўвагі і пажаданні па апублікаванаму праекту Калектыўнага дагавора на 1991 год.

## ПЕРАЛІК

**прафесій і пасад супрацоўнікаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта, якія маюць права на надбаўкі да заработнай платы і іншыя льготы ў сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі працы.**

Надбаўку 24% да асноўнай заработнай платы маюць права атрымліваць наступныя падраздзяленні універсітэта:

— Кафедра агульнай і тэарэтычнай фізікі (загадчык кафедры, інжынер, старшы лабарант, лабарант) — работа ў асноўны працоўны час у лабараторыях ядзернай і атамнай фізікі;

— Кафедра агульнай і тэарэтычнай фізікі, кафедра інжынерна-тэхналагічнай падрыхтоўкі (загадчык кафедры, інжынер, старшы лабарант, лабарант) — абслугоўванне электронных мікраскопаў, рэнтгенаўскіх мікрааналізатараў і дыфрактаметраў імілантараў і іншых прыбораў, якія маюць іанізуючае выпраменьванне;

— Кафедра квантавай электронікі (загадчык кафедры, інжынер, старшы лабарант, лабарант) — работа ў асноўны працоўны час у лабараторыях газавых, цвёрдацельных лазераў, лазераў на фарбавальніках, прымянення лазераў;

— Кафедра прыкладной оптыкі (загадчык лабараторыі, інжынер, старшы лабарант, лабарант) — работа ў лабараторыях фізічнай оптыкі ў асноўны працоўны час, у лабараторыях вымярэнняў, аптычных прыбораў і сістэм, оптыка-электронных прыбораў, сучасных аптычных метадаў дыягностыкі і контролю;

— Капіравальна-памнажальны ўчастак (загадчык участка, інжынер, тэхнік І катэгорыі, тэхнік другой катэгорыі) — работа ў асноўны працоўны час;

— Бібліятэка (загадчык бібліятэкі, намеснік загадчыка бібліятэкі, загадчык аддзела бібліятэкі, метадыст, старшы бібліятэкар, бібліятэкар, старшы бібліёграф, бібліёграф) — работа ў асноўны працоўны час у падвальных і паўпадвальных памяшканнях бібліятэкі.

Надбаўку 12% да асноўнай заработнай платы маюць права атрымліваць наступныя падраздзяленні універсітэта:

— Кафедра квантавай электронікі (загадчык кафедры, інжынер, старшы лабарант, лабарант) — работа ў асноўны працоўны час у фоталабараторыях;

— Кафедра прыкладной оптыкі (загадчык кафедры, інжынер, старшы лабарант, лабарант) — работа ў асноўны працоўны час у лабараторыях метадаў апрацоўкі аптычнай інфармацыі;

— Кафедра радыёэлектронікі і інжынерна-тэхналагічнай падрыхтоўкі (загадчык кафедры, інжынер, старшы лабарант, лабарант) — работа ў асноўны працоўны час у вучэбных лабараторыях кафедры;

— Кафедра біяхіміі (загадчык кафедры, інжынер, старшы лабарант, лабарант) — работа ў асноўны працоўны час у вучэбных лабараторыях кафедры;

— Вылічальны цэнтр (загадчык ВЦ, вядучы інжынер-электронік, інжынер-электронік І катэгорыі, інжынер-электронік ІІ катэгорыі, інжынер-электронік, начальнік змены, вядучы інжынер-праграміст, інжынер-праграміст І катэгорыі, інжынер-праграміст ІІ катэгорыі, інжынер-праграміст ІІІ катэгорыі, інжынер-электронік ІІІ катэгорыі, інжынер-праграміст, старшы праграміст, старшы аператар, аператар) — работа ў асноўны працоўны час;

— Бібліятэка (загадчык бібліятэкі, намеснік загадчыка бібліятэкі, загадчык аддзела бібліятэкі, метадыст, старшы бібліятэкар, бібліятэкар, старшы бібліёграф, бібліёграф) — работа ў асноўны працоўны час у памяшканні бібліятэкі.

**Заўвага:** права на надбаўку да асноўнай заработнай платы і дадатковы водпуск маюць права супрацоўнікі ўказаных падраздзяленняў універсітэта, якія працуюць на ўказаных пасадах на поўную стаўку.

## ПАГАДНЕННЕ

**па ахове працы і тэхніцы бяспекі адміністрацыі і камітэта прафсаюза Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта ім. Я. Купалы на 1991 год**

| № п-п | Змест мерапрыемстваў (работ) | Кошт тыс. руб. | Тэрмін Выканання | Адказны за выкананне мерапрыемстваў (работ) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1. | Здзейсніць перезарадку агнетушыцеляў АХП-10 у вучэбных карпусах і інтэрнатах. | 0,4 | II кв. | Загадчык гаспадаркі, каменданты вуч. карпусоў інтэрнатаў |
| 2. | Правесці рамонт і мантаж вентыляцыйных сістэм у лабараторыях вучэбнага корпуса № 2. | 8,1 | I кв. | Інжынер па ТБ, інжынер па рамонту |
| 3. | Правесці вымярэнні супраціўлення ізаляцыі правадоў, кабеляў і заземляючых контураў ва ўсіх вучэбных карпусах і інтэрнатах | 0,9 | II кв. | Інжынер па ТБ |
| 4. | Устанавіць выцяжную вентыляцыю ў буфеце вучэбнага корпуса № 2 і правесці рамонт вентыляцыі ў інтэрнатах № 2 і № 3 (душавыя) | 5 | II кв. | Інжынер па рамонту |
| 5. | Набыць аптэчкі і медыкаменты для вучэбных карпусоў, інтэрнатаў і лабараторыяў | 0,3 | I кв. | Інжынер па ТБ |
| 6. | Рамонт і абсталяванне лабараторыяў біялагічнага факультэта (вучэбны корпус № 2). | 10 | I кв. | Інжынер па рамонту |
| 7. | Правесці рамонт абсталявання і частковую замену эл. праводкі і свяцільнікаў у сталярнай майстэрні, гаражах і лабараторыях фізфака | 3 | I — II кв. | Адк. за эл. гаспадарку |
| 8. | Правесці выбарчы рамонт у вучэбным корпусе № 3. | 15 | II кв. | Прарэктар па АГР, інжынер па рамонту |
| 9. | Правесці капітальны рамонт у інтэрнаце № 2 (замена санітарна-тэхнічнага абсталявання, аддзелачныя работы). | 100 | II— III кв. | —»— |
| 10. | Правесці выбарачныя аддзелачныя работы ў інтэрнаце № 3. | 20 | III кв. | —»— |
| 11. | Правесці капітальны рамонт ліфта ў буфеце вучэбнага корпуса № 2. | 3 | I кв. | Інжынер па ТБ |

# НА ПАЧАТКУ ШЛЯХУ

Прызнацца, я з насцярожанасцю адгукнуўся на прапанову складальніка М. Мікуліча пазнаёміцца са зборнікам пачынаючых творцаў. Спрабуючы зразумець, у чым тут прычыны гэтае асцярогі, мусіў адзначыць, канешне, што гэтае пачуццё выклікана ці не ў першую чаргу калектыўным характарам невялічкай кніжачкі. Думалася, а ці можа скласціся больш-менш пэўнае ўражанне па, няхай сабе, і адабраных, але ўсё ж колькасна нешматлікіх вершах аднаго аўтара. А потым прамільгнула адна думка, а ці не рознастылёвы атрымаецца зборнік? І ці то гэта разглядаць як станоўчае? А мо як адмоўнае? Ну і яшчэ адзін момант, якому, можа, з майго боку надаецца і празмерная ўвага, але тым не менш. Як усё ж стасуецца творчасць маладых з рэаліямі сёняшняга, менавіта сёняшняга дня? Ці спраўдзяцца спадзяванні на знітаванасць сёняшняга (зразумела, і жыцця, і паэзіі) з не ўчарашнім, а мінулым, каб праз прызму гэтае непарыўнасці не крочыць, а хаця б пракласці, няхай, і вузенькую, але ўсё ж сцяжынку, ды не ў заўтрашняе, а ў будучае. З такімі вось думкамі рушыў я на пошукі...

Адно з найпершых уражанняў, якія пакінуў прачытаны зборнік,— гэта пошукавая накіраванасць усіх без выключэння аўтараў рукапісу. І пошукі гэтыя настолькі разнастайныя, што мушу тут спыніцца. Відаць, пошукі свайго мастацкага стылю, свайго паэтычнага твару, пошукі сваёй тэматыкі, свайго непаўторнага слова — факт заканамерны. Заўважу, у паэзіі, за некаторым выключэннем, практычна ўсе творцы ў той ці іншай ступені праходзілі школу «вучнёўства» (і тут не хацелася б, каб да гэтага слова ставіліся адмоўна). Зрэшты, гэтая асаблівасць уласціва не толькі паэзіі, але не будзем адхіляцца. Вось менавіта пошукамі і можна растлумачыць рыхласць стылю, сэнсавыя недакладнасці, неадпаведнасць у выяўленні думкі, залішнюю зафармалізаванасць, у пэўнай ступені дэкларатыўнасць... Паспрабую падмацаваць свае меркаванні прыкладамі, але, безумоўна, не разглядаючы іх як нешта адмоўнае. Не, для мяне тут істотным з 'яўляецца падкрэсліць вось гэтую пошукавую накіраванасць, бо іменна праз пошукі пры ўмове сталай і сур 'ёзнай працы нараджаецца майстэрства.

Вось, напрыклад, верш «Гайка» Юрася Пацюпы. Мяне, можна сказаць, зачараваў першы радок «Мы — знакі, іерогліфы часоў», але вось настрой гэты не падмацаваўся наступнымі радкамі. Верш абцяжараны наўмыснай складанасцю (...Ты на сямнаццаць міліметраў гайка... // Я разумею, што такое трубка — // І не вяха, і, нават, не зарубка...), цяжка зразумець логіку мыслення аўтара (апошняя страфа).

Але, мне здаецца, што ў Юрася Пацюпы тут было вельмі шмат думак, і, можа, не зрабіўшы спробу ўпарадкаваць іх, надаць нейкую сістэму, ён проста пакрочыў за імі ўслед. А ёсць у Юрася і цудоўныя, на мой погляд, радкі ў розных іншых вершах (Крок наўзбоч — і пасецца трава...), строфы (першая страфа, напрыклад, з верша «Эпічны шлях»). Гэта сведчыць, што аўтару ўласціва сваё бачанне і разуменне свету, ён валодае паэтычным мысленнем. Хочацца спадзявацца, што Ю. Пацюпа спраўдзіцца ў сваіх пошуках.

Сімпатычны некаторымі сваімі вершамі Едрусь Мазько. Асабліва вылучаюцца «Пусты свет», «На дарогу ўпала дрэва...», «З трох зорак — неба...». Разам з гэтым сустракаюцца спалучэнні слоў, радкі, якія, адчуваецца, не могуць характарызаваць творчую манеру аўтара. Яны здаюцца чужынцамі («сухвецце пустаты», «прадажнае (!!) цела гарадской бруканкі», «выкалуплівалась (!!) й спадала лісце»). Мне здаецца ўсё ж, што накірунак свой у Едруся Мазько ёсць, і гэта добра.

Вершы Ігара Заўялава насычаны зместам, прыцягваюць сваімі нечаканымі паваротамі думкі (не буду тут рабіць пералікі, чытач зможа сам пераканацца ў гэтым), ёсць таксама і некаторыя хібы з ліку вышэйадзначаных, але, думаецца, спыняцца на іх няма патрэбы (тут я, можа, аспрэчваю самога сябе, але мне здаецца, што Ігар Заўялаў здольны сам адчуць неўласцівыя для яго моманты).

Спрэчныя думкі пакідаюць вершы Андрэя Пяткевіча. Відавочная спроба асэнсавання ўласнага вопыту адлюстравалася ў розных па сваіх мастацкіх вартасцях зместу творах. Дэкларатыўнасцю, няхай даруе мне аўтар, калі я памыляюся, напоўнены верш «Чырвоная ноч». Але вось прычыны гэтаму, думаецца, ў шматлікіх і шматаблічных папярэдніх разважаннях, якія, у выніку, адбіліся ў гэтакіх форме і змесце. Пры большай патрабавальнасці да сябе, мог бы і можа з 'явіцца зусім новы твор, насычаны адпаведнымі рэаліямі. Не пакідаюць раўнадушнымі вершы «Чорнае», «Гарбуз» (санет), ды і некаторыя іншыя.

А вось Юры Карэйва прыемна здзівіў валоданнем ці, лепей сказаць, знаёмствам з фальклорам, удалым яго выкарыстаннем (хоць бы «Спроба замовы на ўраджай). Не зважаючы на некаторыя стылістычныя і сэнсавыя недакладнасці, хацелася б адзначыць, што на шляху знаёмства з вуснай народнай творчасцю ў Юры Карэйвы ды і іншых аўтараў зборніка могуць быць свае нечаканыя адкрыцці, будзе свой плён.

Нейкае пачуццё разгубленасці пакідаюць вершы Юры Гумянюка. І цяжка асэнсаваць гэтае пачуццё, як і самі вершы. Ці то думкі ўроссып, ці то пасміханне (з каго ці чаго — вось пытанне) разам ці не з самапаставай, ці то што іншае яшчэ... Але не думаю, што для самога Юры Гумянюка ўсё так няпэўна. Пачакаем!

Няхай даруюць мне дзяўчаты, далібог нікога крыўдзіць не хачу, але давайце «выцягнем» з сярэдкі іх Ігара Хоха і Анатоля Валюка. Малавата вершаў прапанаваў Ігар у зборнік. Што гэта, непатрабавальнасць да сябе, залішняя асцярога?.. Думаецца, што калі будзе Ігар больш упэўненым ды больш настойлівы, ён здолее рэалізавацца. Гэтага хацелася б пажадаць і Анатолю Валюку.

Ну вось, і да дзяўчат дайшла чарга (па праўдзе кажучы, я хацеў пачаць менавіта з дзяўчат, ды вось, кіруючыся логікай складальніка зборніка М. Мікуліча, пайшоў услед за ім).

Апанавала мяне пачуццё ўдзячнасці прадстаўленым у зборніку дзяўчатам за іх шырыню бязмежную пачуццяў, за іх дабрыню бясконцую, за шчырасць іх. Нялёгка, вельмі нялёгка гаварыць пра паэзію жаночую наогул, што зусім зразумела. Шчырасцю пачуццяў прываблівають мяне вершы Ірыны Гарлінскай. Ці не ўласны вопыт жывіць творы Аксаны Чэрнік, і асабліва «Фініш». Перапоўнены лірычнай самаахвярнасцю вершы Ганны Шакалей, метафарычнасцю — Святланы Станевіч, бездапаможна моцная — Таццяна Абухоўская.

Вось такія думкі, разважанні выклікаў ў мяне калектыўны зборнік «Шлях». Сказаць, што зборнік атрымаўся цэласным ва ўсіх аспектах, я, відаць, устрымаюся. Адно несумненна, цэласнасць зборніка выяўляецца найперш у яго пошукавай плыні. Назіраецца пэўная пераемнасць паміж паэтычнымі традыцыямі ўчарашняга і сённяшняга, але, на мой погляд, сувязі гэтыя недастаткова пакуль трывалыя. Часцей яны праяўляюцца ў агульных матывах.

...Сцяжынка ў заўтрашні дзень ёсць. У будучыню ж — пакажа час.

Яшчэ хочацца адзначыць, што пры ўмове заўсёднай сталай працы і сур 'ёзным падыходзе да справы многія, калі не ўсе, з паэтаў могуць рэалізавацца як Творцы.

І апошняе. Радуе, што ў такі складаны час, які зусім, здаецца, не лагодны да творчасці, тым больш паэтычнай, Паэзія прыцягвае да сябе, моладзь спрабуе выказаць сябе (і гэтым самым ці не паўплываць на нас усіх). Дык што ж, жывём!

Думаю!

Алесь ЦІТАВЕЦ,
кандыдат філалагічных навук, навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

# НА ЭКРАНАХ ГОРАДА

Вы любіце Іну Чурыкаву — актрысу, якая стварыла незабываемыя жаночыя вобразы ў фільмах «Прашу слова», «Валянціна», «Кур 'ер» і інш? Тады спяшайцеся ў красавіку ўбачыць новы мастацкі фільм **«Рабро Адама»**, дзе Чурыкава выконвае ролю мамы дзвюх дарослых дачок, ролю нашай сучасніцы, якая перажывае душэўны крызіс. І дочкі на выдані, і сама маці яшчэ можа ўладкаваць сваё асабістае жыццё. Але не так проста ўсё гэта!..

Звяртае на сябе ўвагу вострасюжэтная драматычная стужка **«Кат»**. Гераіня фільма, маладая журналістка, становіцца на шлях жорсткай помсты, каб адпомсціць чатыром падонкам, якія яе згвалцілі. Яна аддае ўсе свае зберажэнні ўладару падпольнай мафіі, для якой не існуе закону... Галоўную ролю выконвае Ірына Мятліцкая.

Унікальным дарам — узрываць прадметы і ствараць пажары намаганнем волі — валодае герой карціны **«Духаў дзень»**, якая пастаўлена на кінастудыі «Голас».

Хочаце весела правесці час у кіназале? Спяшайцеся паглядзець кінакамедыю **«Бабнік»**, дзе галоўную ролю выконвае Аляксандр Шырвіндт. Уявіце сабе ўжо немаладога халасцяка ў аднапакаёвай кватэры, які спазнаў усе таямніцы жаночай спакусы. Але аднойчы, як снег на галаву, нечакана ў кватэры з 'яўляецца сын героя, дваццацігадовы хлопец, якому перадалося ад бацькі захапленне жанчынамі. І герою нічога не застаецца, як паглядзець на самога сябе «збоку»...

Выходзіць на экраны і **«Чорная ружа, эмблема смутку, чырвоная ружа, эмблема кахання»**, якую паставіў рэжысёр Сяргей Салаўёў. Гэты фільм можна назваць «кактэйлем» з меладрамы і любоўнай гісторыі, палітычнага гратэску і музычнай камедыі, цырка, эстрады, пантамімы. Галоўную ролю выконвае прыгажуня Таццяна Друбіч («Сто дзён пасля дзяцінства» і інш.).

Кітайская стужка **«Сакрэтны ўказ імператара»** — супербаявік для аматараў усходняй барацьбы, прыгодаў і экзотыкі.

Амерыканскі фільм **«Зорныя войны»** павінен зацікавіць аматараў кінафантастыкі.

Стужка «Анёлачак» раскажа гледачам аб праследаванні непаўналетняй прастытуткі сэксуальным маньякам. Ён ужо зверскі забіў шмат «начных матылькоў», таму што забойца здольны цешыцца толькі целам мёртвай жанчыны.

**«Пляжныя дзяўчынкі»** — таксама амерыканская карціна — яна расказвае аб забавах моладзі, якая забаўляецца на марскім курорце без нагляду строгіх мам.

У Германіі пастаўлена крымінальная камедыя **«Узлом»**, у якой расказваецца дзёрзкім рабаўніцтве банка ў Берліне.

Балгарская стужка **«Бяз драпіны»** расказвае пра знакамітага барца, які выйшаў з беднай сям 'і.

Англійскі фільм **«Тысячагоддзе»** — кінафантастыка аб падарожжы на машыне часу і каханні мужчыны і жанчыны.

**На здымку:** кадр з фільма «Тысячагоддзе».



Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшкі, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня
вул: Паліграфістаў, 4.
т.2000 Зак. 2447

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА,
ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ,
ПАРТКАМ, ПРАФКАМ
СТУДЭНТАЎ,
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.

С. М. ЛАЎНІК